Сустрэча

# У ГАСЦЯХ — ВЕТКАЎСКІ МУЗЕЙ

***У бібліятэцы-філіяле № 4 па вуліцы Багданава загадчык філіяла Веткаўскага музея стараверства і беларускіх традыцый імя Ф.Р. Шклярава Пятро Цалка правёў гісторыка-краязнаўчую гадзіну пад назвай "Традыцыі жывая нітка".***

Пятро Цалка распавёў падлеткам, якія прыйшлі на сустрэчу, пра ўзнікненне друкаваных кніг і традыцыі кнігадрукавання на Беларусі. Вучні даведаліся пра друкавальны станок Гутэнберга, на якім працавалі першадрукары Пятро Мсціславец і Францыск Скарына, аздабленне кніг, а таксама тое, як расшыфраваць старажытнаславянскія літары. Цікавым быў расповед пра гравюры ў старажытных кнігах. Дагэтуль не высветлена, ці рабіў Францыск Скарына ў сваіх пражскіх выданнях, у прыватнаці "Псалтыры", малюнкі ўласнаручна, бо нашчадкі сёння маюць у руках толькі ўскосныя гіпотэзы наконт таго, ці быў Скарына яшчэ і мастаком. Як бы ні было, але той, хто стварыў гравюры ў кнігах Скарыны, адчуваў свет і думаў амаль як ён сам. Мерапрыемства стала своеасаблівым цікавым экскурсам ад дзён мінулых да сучаснасці. Дзеці пазнаёміліся не толькі з кнігамі музейнага фонду, а і з чытанкамі, што стаяць на бібліятэчных палічках.

**Іван ШУТАЎ.**

Фота **М. Сусла.**

